Учреждение образования Федерации профсоюзов Беларуси
«Международный институт трудовых и социальных отношений»

Витебский филиал

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ В ИЗУЧЕНИИ И ПРЕПОДАВАНИИ ОБЩЕСТВЕННО-ГУМАНИТАРНЫХ НАУК (ДИСЦИПЛИН)

*Материалы*
*I (Первой) Международной научной конференции*

*2-3 декабря 2010 г.*

Витебск 2010

УДК 372.8 +30
ББК 74.58
А 43

Печатается по решению Научно-методического Совета Витебского филиала УО ФПБ «МИТСО» (протокол № 2 от 15 ноября 2010 г.).

*Рецензенты:*

**Сапожникова Г.Н.** – старший научный сотрудник Института всеобщей истории Российской Академии наук (РАН, г.Москва, РФ), кандидат исторических наук;
**Лобок Д.В.** – заведующий лабораторией по анализу и прогнозу профсоюзного движения Санкт-Петербургского Гуманитарного университета профсоюзов (Санкт-Петербург, РФ), кандидат исторических наук, доцент.
**Космач Г.А.** – зав. кафедрой новой и новейшей истории УО «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка» (г.Минск, РБ), доктор исторических наук, профессор;
**Слемнев М.А.** – профессор УО «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова» (г.Витебск, РБ), доктор философских наук, профессор.

*Редакционная коллегия:*
**Космач В.А.** (главный редактор),
**Костырева С.С.** (заместитель главного редактора),
**Стародынова С.М., Горячева С.М., Катащук Д.В.,**
**Трацевская Л.Ф., Кулиев С.И.**

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ В ИЗУЧЕНИИ И ПРЕПОДАВАНИИ ОБЩЕСТВЕННО-ГУМАНИТАРНЫХ НАУК (ДИСЦИПЛИН).** ***Материалы I (Первой) Международной научной конференции***, *2-3 декабря 2010 г. – Витебск: Витебский филиал УО ФПБ «МИТСО», 2010. – 692 с.*

В сборник включены материалы участников конференции по актуальным вопросам изучения и преподавания общественно-гуманитарных наук (дисциплин): в области истории, экономики, права, отечественного и зарубежного языкознания и литературоведения, психологии и педагогики и др. Материалы научной конференции рассчитаны на студентов, магистрантов, аспирантов и преподавателей высших учебных заведений, научных сотрудников, работников государственных, профсоюзных и общественных учреждений и организаций.

Материалы научных статей представлены в авторской редакции.

УДК 372.8 +30
ББК 74.58
А 43
© Витебский филиал УО ФПБ «МИТСО», 2010

7. Снапковский В.Е. Проблема репараций с Германии для Беларуси // Рапальская политика: истоки, традиции и современность: тез. доклад. Мн., 1992.
8. Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944-1953 гг. Мн., 1997.
9. Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ на территории Беларуси: 1944-1951 гг. Мн., 2003.
10 Шарков А.В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси. Роль органов внутренних дел в их содержании и использовании 1944-1951 гг. Мн., 1997.

## АДНОСІНЫ ПАМІЖ ЦЫВІЛЬНЫМ НАСЕЛЬНІЦТВАМ І ПОЛЬСКІМ ПАДОЛЛЕМ У ПЕРЫЯД СА СТУДЗЕНЯ 1945 ПА 1948 ГОД НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*А.Ф. ВЯЛІКІ , Я.А. ЗАДРУЦКІ*
*Мінск, УА «БДПУ імя М. ТАНКА»*

Адной з важных праблемаў гісторыі з'яўляецца вывучэнне дзейнасці Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Пытанні ўсё яшчэ застаюцца: ці была Армія Краёва і польскае падполле вызвольным, антыфашысцкім рухам, ці гэта была антыбеларуская, бандыцка-тэрарыстычная арганізацыя. Каб раставіць усе кропкі над і неабходна бадрабязнае і крапатлівае вывучэнне дзейнасці польскага супраціву на тэрыторыі Беларусі. Ужо зараз можна сказаць, што вынікі гэтыя, неадназначныя.

19 студзеня 1945 году – адметная дата ў гісторыі польскай Арміі Крёвай. У гэты дзень, Леапольд Акуліцкі аддаў загад аб роспуску Арміі Краёвай. Загад зусім не азначаў спынення барацьбы. Фактычна, загад аб роспуску толькі канстатаваў факт пераходу дзейнасці польскага супраціву з адкрытай канфрантацыі на падпольную барацьбу. Паводле тэксту гэтага загаду: «...п.3. АК распушчана. Камандзіры не легалізуюцца. Жаўнераў вызваліць ад прысягі, выплаціць 2-х месячную помач і заканспіраваць. Зброю схаваць...». [1 , 289]

Гэтую работу па падпольнай барацьбе павінна была весці новая арганізацыя пад назваю «Не» (польск. «Неподлеглосць»). У мэты гэтай арганізацыі ў прыватнасці, уваходзілі: збіраць кадры арганізацыі, захоўваць зброю для легальнай работы і падрыхтоўкі паўстання супраць СССР; ствараць узброенныя баявыя атрады ў колькасці не больш за 60 чалавек у кожным; ствараць тэрарыстычныя, так званыя ліквідацыйныя групы, ажыцяўляць тэрарыстычныя акты над праціўнікамі АК і прадстаўнікамі савецкага камандвання; рыхтаваць кадры дыверсантаў для ажыццяўлення дыверсійных актаў толькі ў перыяд набліжэння моманту паўстання. [4 , 208] Аднак, надзеі польскага падполля не спраўдзіліся: «Не» была выкрыта і разгромлена савецкімі органамі бяспекі.

Аднак, працягвалі барацьбу часткі і жаўнеры былой АК. Аснову «постакаўскага падполля» на тэрыторыі Беларусі склалі фармаванні Беластоцкага Округа – Ваўкавыскі, Гродзенскі, Індурскі абводы, а таксама захаваўшыеся на арганізацыйным узроўне абводу падпольныя злучэнні Наваградскага і Віленскага акругоў АК. У іх склад уваходзілі ў асноўным удзельнікі з мясцовага насельніцтва. Менавіта за гэты перыяд, калі польскі эміграцкі ўрад згубіў дыпламатычную падтрымку ЗША і Вялікабрытаніі, а СССР дабіўся рашэння «польскага пытання» на сваю карысць, польскае падполле набыло яскрава выражаны антысавецкі характкар. [4 , 93]

У гісторыі барацьбы найважнейшае значэнне мелі ўмовы, ў якіх трэба было дзейнічаць падпольшчыкам, а ўмовы складалі стасункі паміж падполлем і мясцовым насельніцтвам.

У гісторыі стаўлення насельніцтва можна вызначыць два адрозныя этапы: перад перасяленнем палякаў з Беларусі ў Польшчу і пасля перасялення.

Сітуацыя перад перасяленнем характарызуецца дамінаваннем палякаў у палітычным і культурным жыцці ў Заходняй Беларусі. Таму насельніцтва, у тым ліку і беларускае, апынулася перад дзьвума ўладамі – уладай польскага падполля і савецкай уладай. Гэта быў перыяд найбольш моцнага супраціву савецкай уладзе, бо базай супраціву было польскае насельніцтва. Значную дзейнасцб праводзілі каталіцкія святары. У адной з дакладных запісак аб дзейнасці рыма-каталіцкай царквы ў Берасцейскай вобласці адзначалася: «З першых дзён пасля выгнання немцаў каталіцкае духавенства падтрымлівае цесную сувязь з польскім нацыяналістычным падполлем, вядзе агітацыю сярод палякаў за аднаўленне Польшчы ў межах 1939 года.» [4 , 162] Польскае падполле ўсяляк супраціўлялася перасяленню палякаў у камуністычную Польшчу, што мела сур'ёзныя вынікі для працэсу перасялення.

Сітуацыя рэзка змянілася ў лютым 1945 года. У гэты час, падполле стала наадварот, прыкладаць намаганні, каб усё польскае насельніцтва рэгістравалася і выязджала ў Польшчу. У паведамленні Гродзенскага райпрадстаўніцтва адзначалася, што «пасля Крымскай канферэнцыі, дзе было заяўлена, што мяжа Польшчы на ўсходзе будзе праходзіць па лініі Керзана... польскія белабандыты ўзяліся за новую агітацыю. Польскае насельніцтва пад пагрозамі зброі вымушалі рэгістравацца і перааязджаць у Польшчу любым шляхам. Такія факты асабліва назіраліся ў Воранаўскім раёне, дзе зарэгістравалася на выезд амаль 100% усяго насельніцтва раёна». [5 , 110]

Польскае антысавецкае падполле мела шырокую сетку сувязных, трымальнікаў канспіратыўных і явачных пунктаў і асведамляльнікаў з ліку мясцовага насельніцтва. Многія мясцовыя жыхары станавіліся нявольнымі закладнікамі склаўшайся сітуацыі і аказвалі судзеянне акаўцам пад пагрозай фізічнай расправы над імі і чальцамі іх сем'яў. У адной з дакладных запісак за 1945 г. начальніка УНКУС БССР па Полацкай вобласці падпалкоўніка Ефрыменка начальніку УББ НКУС БССР паведамлялася: «...Наяўнасць бандыцкіх фармаванняў на тэрыторыі вобласці аказвае значны ўплыў на правядзенне партыі і ўрадам мерапрыемстваў. Бандыцкі і варожы да Савецкай улады элементы прапаноўваюць савецкаму актыву... і іх радне адмовіцца ад займаемых пасадаў, пагражая пры гэтым ім рэпрэсіямі... Уся вышэйзгаданая дзейнасць бандыцкага антысавецкага элементу знаходзіць свой водгук сярод вызначанай частцы польскага і беларускага насельніцтва...» [1 , 285]

Пасля акцыі перасялення, дзейнасць польскага падполля пайшла на змяншэнне. Самі падпольшчыкі паступова маргіналізаваліся, пераўтварыўшыся часта ў звычайных бандытаў, якія тэрарызавалі як польскае, так і

беларускае насельніцтва. На працягу 1945-1948 гг. дадзенымі фармаваннямі толькі на тэрыторыі Гродзенскага раёну было здзейснена прыблізна 70 тэрактаў, у выніку якіх было забіта 107 чалавек. З іх ваеннаслужачых Чырвонай Арміі – 10 чалавек, супрацоўнікаў НКУС і міліцыі – 9 чалавек, партыйна-савецкіх актывістаў – 12 чалавек, мірных жыхароў – 76 чалавек. [1 , 304] Такім чынам, большасць ахвяраў дзейнасці постакаўскіх фармаванняў склалі мірныя жыхары – беларусы, палякі, рускія.

На тэрыторыі Гродзенскага раёна гэтымі постакаўскімі фармаваннямі быў ажыццеўлены шэраг тэрарыстычных актаў: 20 лістапада 1945 г. у вёсцы Малая Альшанка Гібуліцкага сельскага Савета здзейснены напад на дом намесніка кіраўніка сельсавета Сідаровіч. У выніку чаго растраляны Сідаровіч і яго жонка, дачка, другая дачка цяжка паранена. 2 чэрвеня 1946 г. у вёсцы Прывалкі былі забіты кіраўнік сельсавета Гуліда Мікалай Пятровіч і спалены яго дом, намеснік поштай Кісель Іпаліт, заведуючы бібліятэкай Пелуць Уладзіслаў, дэпутаты Сельсавета вёсцы Прывалкі Лапацінскі Раман і Лапацінскі Вікенты, а таксама жыхар Прывалак Барцэвіч Уладзіслаў. Пасля было ўстаноўлена, што тэрарыстычны акт правёў атрад «Фалі». 12 чэрвеня 1946 года, удзельнікамі гэтага ж атраду былі затрыманы жыхары вёсцы Узбераж Ліхачэўскага сельсавета: Грыч Іван, былы савецкі партызан, і Грыч Марцін, дэпутат сельсавета, якіх пасля здзекаў павесілі. У канцы кастрычніка 1947 г. групай «Камара» у вёсцы Чэшэўляны забіты жыхары гэтай вёсцы Сурмач Леанід і яго маці Сурмач Ганна. 7 снежня 1947 атрадам «Фалі» у колькасці да 12 чалавек было здзейснена забойства 5 жыхароў вёсцы Казіміраўка. [10 , 304]

У цэлым, за 1944-1947 акаўскім і постакаўскімі фармаваннямі здзейснена 575 тэрактаў, 39 дыверсій, 252 напады на дзяржустановы, у выніку якіх загінула 96 супрацоўнікаў МУС-МДБ, 107 служачых Савецкай Арміі, 290 чалавек партыйна-савецкага актыву, 1031 мірны жыхар. [1 , 307]

*Літаратура*


1.Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939 — 1954 гг.). — Гродно: УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», 2004.

2. Сямашка Яўген. Армія Краёва на Беларусі. - Мн.: Беларускае выдавецкае Таварыства «Хата». 1994. - 416 с.

3. Валаханович И. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944 — 1953 гг. Менск: БДУ, 2002

4. Ярмусик Эдмунд. Католический Костёл в Беларуси в 1945 - 1990 годах. - Гродно.: Гродненский Государственный Университет имени Янки Купалы. 2006. - 568с., илл. 47, табл. 56, библ.

5. Вялікі А. Ф. На раздарожжы. Беларусы і палякі у час перасялення (1944-1946). - Мн. : БДПУ, 2005.- 319 с.


## ДЗЕЙНАСЦЬ НЕЛЕГАЛЬНЫХ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ МОЛАДЗІ Ў БССР (ПА МАТЭРЫЯЛАХ СЦЕНАГРАМ З'ЕЗДАЎ КПБ У 1960-1970-Я ГГ.)


*І.А. ПУШКІН*

*Магілёў, УА "МДУХ"*


З другой паловы 1960-х гг. у СССР пачаўся, так званы, застойны перыяд. З аднаго боку, ён быў пэўным крокам наперад у эканамічным і сацыяльным развіцці. Асабліва гэта характэрна для 8-й пяцігодкі. Гаспадарка дасягнула за гэты час новых рубяжоў. Затым тэмпы развіцця сталі паступова зніжацца. З другога боку, у той час час расквітнелі фармалізм, бюракратызм, русіфікацыя, ідэалагічны ўціск. Нацыянальная палітыка была накіравана на інтэрнацыяналізацыю грамадскага жыцця. Вярталася сталінская сістэма кіравання, але не такая рэпрэсіўная.

Грамадска–палітычнае жыццё з'яўлялася галоўнай сферай увагі кіруючай улады. У савецкі час дзяржаўна–камуністычны манапалізм панаваў паўсюль. Склалася дамінуючая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў палітычная культура з таталітарнай свядомасцю. Дзяржава падпарадкавала сабе чалавека. Гэта перашкаджала свабодным праявам грамадскіх сіл. Празмернае апякунства дзяржавы над грамадзянамі нанесла вялікую шкоду энергіі, дзейнасці, маралі людзей, у выніку – асобы адмаўляліся ад значнай часткі самастойнасці і адказнасці. З'явілася сацыяльная апатыя і іншыя негатыўныя з'явы.

Аднак, нягледзячы на гэта, у часткі насельніцтва Беларусі не была цалкам вынішчана грамадская актыўнасць і нацыянальная самасвядомасць. Назіралася імкненне захавання нацыянальных адметнасцей праз стварэнне рознага роду аб'яднанняў [1, с. 26-27] і ў рэлігійнай сферы. Усе гэтыя спробы пільна адсочваліся КДБ і выкараняліся. Аб гэтым неаднаразова казалася ў выступах старшыні КДБ БССР на XXV, XXVI, XXVII з'ездах кампартыі Беларусі.

Неабходна мець на ўвазе, што дзейнасць любых грамадскіх аб'яднанняў, створаных не па ініцыятыве камуністычнай партыі, у СССР забаранялася. Ініцыятары падвяргаліся рэпрэсіям з боку ўлад.

У сваім выступе на XXV з'ездзе КПБ старшыня КДБ пры СМ БССР У.І. Пятроў адзначыў, што на працягу 1960 г. і 8-мі месяцаў 1961 г. КДБ і яго мясцовыя органы правялі "прафілактычныя" размовы з амаль 1000 чал. Сярод іх 32 % складала моладзь да 25 год.

У красавіку 1961 г. ад сваёй агентуры органы КДБ атрымалі дадзеныя аб існаванні ў Гродна нелегальнай маладзёжнай групы пад назвай "Клуб вольнай моладзі", у якую ўваходзілі юнакі 1940-45 гг. нараджэння, двое з іх з'яўляліся членамі УЛКСМ. Як было ўстаноўлена праверкай КДБ, удзельнікі гэтай групы, пад уплывам радыёперадач з замежжа, сталі выказваць крытычныя (на думку тагачаснага кіраўніцтва – паклёпніцкія) меркаванні на савецкую рэчаіснасць. На кватэры аднаго з удзельнікаў групы Станішэўскага быў знойдзены Статут "Клуба" і нататкі антысавецкага зместу. Займаючыся гэтай групай моладзі, органы КДБ атрымалі новыя дадзеныя аб існаванні ў Гродна яшчэ двух маладзёжных груп, якія называлі сябе "Саюз вольнай моладзі" і "Вольная думка", у складзе якіх было 9 чалавек вучняў старшых класаў СШ і студэнтаў ВНУ, сярод іх былі камсамольцы.

Удзельнікі гэтых маладзёжных груп на сваіх сходах абмяркоўвалі праекты "праграмы" і "статута", палітыку і мерапрыемствы, якія праводзіліся партыяй і ўрадам. Органы КДБ спынілі існаванне гэтых арганізацый. Дзейнасць і ўчынкі "нелегалаў" былі абмеркаваны на сходах калектываў па месцу іх вучобы і працы. [3, арк. 352-353]